кароннага трыбунала, а аналагічнае правіла для пасольскіх соймікаў, нароўні з дапушчэннем да выбараў толькі аселага шляхты, было складзена ў канстытуцыі, якая фармальна адносілася толькі да соймікаў Брацлаўскага ваяводства, што пазней меркавалася распаўсюдзіць на ўсе соймікі Рэчы Паспалітай [7, с.30].

Такім чынам, соймавая рэформа 1764 года ў Рэчы Паспалітай стала новым этапам у працэсе развіцця парламентарызму на нашых землях, бо ўводзіліся прынцыпова новыя палажэнні, якія павінны былі пераадолець састарэлыя інстытуты ўлады, не адпявядаючыя патрабаванням таго часу. Аднак рэформа не атрымала поўнага ажыццяўлення.

## Бібліяграфічныя ссылкі


1. Гісторыя Беларусі: у 6 т. / рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. Мінск: Экаперспектыва, 2007. Т. 3: Беларусь у часы Рэчы Паспалітай (XVII–XVIII стагоддзе) / Ю. Бохан [і інш.]. 2007. 344 с.
2. Носов Б.В. Установление российского господства в Речи Посполитой. 1756 – 1768 гг. / Отв. ред. В.К. Волков. М.: Индрик, 2004. 728 с.
3. Юхо Я.А. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі : вучэб. дапам : у 2 ч. Мінск : РІВШ БДУ, 2000. Ч. 1. 352 с.
4. Konarski S. O skutecznym rad sposobie i inne pisma polityczne / Wrocław : Zakład Narodowy im. Ossolińskich. Wydawnictwo ; Warszawa : we swpółpr. z De Agostini Polska, cop. 2005. 347 l.
5. Korzon Tadeusz Wewnetrzne dzieje Polski za Stanislawa Augusta (1764 – 1794) badania historyczne ze stanowiska ekonomicznego i administracyjnego T.3. Kraków : Księgarnia L. Zwolińskiego i S-ki ; Warszawa : nakł. Księgarni Teodora Paprockiego i S-ki, 1897. 491 s.
6. O porzadky seymowania / Volumina legum. Petersburg: Nakładem i drukiem Jozafata Ohryzki, 1860. T. VII. L. 17-18.
7. Rozdzielenie Trybunalow Koronnych / Volumina legum. Petersburg: Nakładem i drukiem Jozafata Ohryzki, 1860. T. VII. L. 30-33.


# АБ ПРАБЛЕМАХ ЦЭНТРАЛІЗАЦЫІ ЎЛАДЫ Ў ВЯЛІКІМ КНЯСТВЕ ЛІТОЎСКІМ І КАРОНЕ ПОЛЬСКАЙ


***В. М. Бічун***

Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,
г. Мінск, Рэспубліка Беларусь



У артыкуле разглядаюцца тэндэнцыі, якія перашкаджалі цэнтралізацыі ўлады Польшчы і Вялікага Княства Літоўскага.

В статье рассматриваются тенденции, которые препятствовали централизации власти Польши и Великого Княжества Литовского.

The article deals with trends that impeded the centralization of the of the power in Poland and the Grand Duchy of Lithuania.

***Ключавыя словы:*** Вялікае Княства Літоўскае; Польшча; цэнтралізацыя дзяржаўнага ўладкавання; Вялікі князь; сойм; Рада.

***Ключевые слова:*** Великое Княжество Литовское; Польша; централизация государственного устройства; Великий князь; сойм; Рада.

***Keywords:*** the Grand Duchy of Lithuania; Poland; centralization of government; Grand Duke; Sejm; Rada.

XVI стагоддзе – пераломны час у гісторыі Заходняй Еўропы, калі ў межах Рэфармацыі пачаўся пошук мадэляў цэнтралізацыі дзяржаўнага ўладкавання, якія б замянілі саслоўна-прадстаўнічую мадэль улады. Так, у першых “новых” манархіях – Францыі, Англіі, Іспаніі – паступова ўзмацнялася роля караля, які адмаўляўся ад склікання саслоўна-прадстаўнічых органаў, фарміраваўся разгалінаваны бюракратычны апарат і стваралася пастаяннае войска. Гэта абумоўлівала больш агрэсіўную знешнюю палітыку, якая спрыяла аналагічным працэсам у іншых краінах. Але цэнтралізацыя амаль не закранула тэрыторыю Польшчы і Вялікага Княства Літоўскага (далей – ВКЛ), аб’яднаных з 1569 года у адзіную дзяржаву – Рэч Паспалітую. На наш погляд, гэтаму паспрыяла наступнае.

У дауніяльны перыяд (да 1385 года) Польшча і ВКЛ мелі розныя мадэлі дзяржаўнага і саслоўнага ладу. У Польшчы Кароль паступова перадаваў уладу іншым саслоўям праз прывілеі, але ў ВКЛ дынастыя Гедымінавічаў валодала вельмі шырокімі патэрналісцкімі паўнамоцтвамі. Гэта не патрабавала, да пэўнага часу, стварэння калегіяльных прадстаўнічых органаў кіравання, замест якіх існавала сістэма вышэйшых дворных і мясцовых пасад, заснаваных на прынцыпах прызначэння і адзінаначалля.

Заключэнне Крэўскай уніі абумовіла аб’ектыўную трансфармацыю статуса Вялікага князя, які, з аднаго боку, традыцыйна заставаўся гаспадаром дзяржавы і меў усю паўнату ўлады, а, з другога боку, паступова набываў статус службовай асобы, абавязанай здзяйсняць рашэнні рады і сойма, дзейнічаць у поўнай адпаведнасці з законам. Такі “дваісты” статус адлюстроўваў некалькі супярэчлівых тэндэнцый. Па-першае, імкненне Ягелонаў выкарыстаць свае патрыярхальныя правы на ВКЛ для дасягнення дынастычных мэтаў па-за межамі дзяржавы. Па-другое, імкненне паноў-рады, як першапачаткова дарадчага органа і калектыўнага прадстаўніка Вялікага князя ў дзяржаве ў перыяд яго

адсутнасці, адстойваць інтарэсы ВКЛ, што можна характарызаваць як спробу стварэння пэўнай сістэмы стрымак і супрацьваг, бо Рада не была ўпэўнена ў шчырым выкананні Гаспадаром сваіх абавязкаў у дачыненні да Літвы [4, с. 88].

Адной з прычын стварэння органаў, якія прадстаўлялі шырокія колы феадалаў, або пашырэння правоў Рады трэба прызнаць канфлікт Караля (Вялікага князя) з магнатамі, пры якім Глава дзяржавы быў вымушаны звярнуцца да іншых саслоўяў, і ў першую чаргу да шляхты. Гэта прывяло да склікання больш шырокіх нарад феадалаў – пашыранага пасяджэння Рады – соймаў, якія ў XIV –XV стагоддзях мелі больш значэнне органа дарадчага, але паступова набылі заканадаўчыя функцыі. У канцы XVI стагоддзя сойм набывае пэўныя рысы феадальнага парламента. У гэты перыяд у яго ўваходзілі Вялікі князь і паны радныя – як вышэйшая палата сойма, а таксама прадстаўнікі ад мясцовай шляхты – як ніжэйшая палата [3, с. 60]. Пры гэтым канфлікт манарха і магнатаў у Польшчы і ВКЛ першапачаткова меў розныя прычыны. Калі ў Польшчы Кароль паступова страчваў свае паўнамоцтвы, то ў Літве Рада імкнулася абмежаваць уладу Вялікага князя ў інтарэсах дзяржавы.

Адначасова на працэсы цэнтралізацыі ўплывалі імкненні Польшчы інкарпарыраваць ВКЛ у якасці правінцыі, што, па сутнасці, было рэалізавана падчас Люблінскай уніі 1569 года [1, с. 410]. Адзначым, што па даволі «рамантызаванай» пазіцыі І.А. Юхо уніі, якія ВКЛ заключыла з Польшчай, не прывялі да ліквідацыі ВКЛ і не падарвалі яго адасобленасці і суверэннасці [6, с. 106].

Інкарпарацыйныя імкненні Польшчы абумовілі незацікаўленасць эліты ВКЛ па ўзмацненню і цэнтралізацыі свайго “саюзніка”. Гэтая пазіцыя была замацавана прывілеем Казіміра 1447 года, які заканадаўча замацоўваў тэрытарыяльную цэласнасць дзяржавы, яе суверэнныя правы і адначасова забараняў раздаваць чужаземцам дзяржаўную маёмасць і пасады. Асабліва ярка ідэя роўнасці дзяржаў была выяўлена ў пастанове Віленскага сойма 1563 года, у якой гаспадар абавязваўся не парушаць папярэдніх законаў (“перших привильев”), а дэлегатам даручалася строга ахоўваць гонар і годнасць ВКЛ, сачыць за тым, каб правы ўсяго насельніцтва дзяржавы не парушаліся і не былі прыніжаныя Польшчай. Такія ўмовы пацвярджаліся і падтрымліваліся шляхтай на ўсіх наступных соймах ВКЛ. У Статуце 1588 года было таксама замацавана палажэнне аб тэрытарыяльнай цэласнасці дзяржавы і яе недатыкальнасці (р.3, арт.1), тым самым Статут абвясціў суверэнітэт ВКЛ насуперак Люблінскай уніі. Закон увогуле абавязваў гаспадара

вярнуць усё тое (меліся на ўвазе землі), што было калісьці “разобрано” і “упрошено” іншымі дзяржавамі [5, с. 54].

Такім чынам можна сцвярджаць, што ў Польшчы і ВКЛ больш дамінавалі тэндэнцыі, якія супрацьстаялі цэнтралізацыі і якія мелі адпаведную дзяржаўную спецыфіку, што і абумовіла будучыя падзелы Рэчы Паспалітай.

## Бібліяграфічныя ссылкі


1. Андерсон П. Родословная абсолютистского государства. М. : Территория будущего, 2010. 512 с.
2. Васілевіч Р.А., Доўнар Т.І., Юхо Я.А. Гісторыя канстытуцыйнага права Беларусі. Мінск : ВТАА “Права і эканоміка”, 2001. 363 с.
3. Доўнар Т.І. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі. Мінск : Амалфея, 2008. 400 с.
4. Калінін С.А. Аб тэарэтыка-метадалагічных праблемах вывучэння беларускай дзяржаўнасці // Гісторыя і сучаснасць : беларуская дзяржаўнасць ва ўсходнееўрапейскім цывілізацыйным кантэксце : зборнік навуковых прац, прысвечаных 90-годдзю з дня нараджэння прафесара Я.А. Юхо / рэдкал.: С.А. Балашэнка (гал. рэд.) і [інш.]. Мінск : Бизнесофсет, 2012. С. 88.
5. Статут Вялікага княства Літоўскага 1588 : Тэксты. Даведнік. Каментарыі. Мінск, 1989. 253 с.
6. Юхо Я.А. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі: у 2 ч. Мінск : РІВШ БДУ, 2000. Ч. 1. 352 с.